# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

5 СНЕЖНЯ 1996 года
чацвер
№18
(1754)


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


Газета па-французску... Ці выдавец - рэаліст або летуценнік?
Рарытэтнае выданне -- у фондах аддзела рэдкай кнігі.

Стар. 2

Працяг знаёмства з Ліяй Іевіч і яе вершамі.
Калі не "перакінуцца ў карцішкі", дык хаця б паназіраць за прэферансістамі прапануе наш пастаянны аўтар.

Стар. 3

Мастацкая старонка: апавяданне "Гульня на дваіх" і гумарэска "Залік"

Стар. 4


## Постфактум

*15 лістапада 1996 года ў студэнцкай кавярні "Гаўдэамус" па ініцыятыве студгарадка прайшоў "круглы стол" студэнцкіх Саветаў інтэрнатаў "Універсітэт — час цяперашні і будучы", на якім узнімалася пытанне новага статусу Белдзяржуніверсітэта, а таксама мераў адміністрацыі і студэнцкага актыву па рэалізацыі праграмы, закладзенай ва Указах Прэзідэнта Беларусі. Абмяркоўвалася становішча ў інтэрнатах і шляхі вырашэння сацыяльных, гаспадарчых і выхаваўчых праблемаў. На сустрэчы прысутнічалі і выступілі першы прарэктар П.І.Брыгадзін, прарэктар па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях А.В.Паўлаў, кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска В.І.Мяц, начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю А.Б.Багдановіч, дырэктар студгарадка А.У.Мелех, намеснік дырэктара студгарадка па выхаваўчай рабоце Р.П.Папок, намеснік старшыні прафкама студэнтаў Р.А.Акунец, каардынатар студэнцкіх Саветаў інтэрнатаў Белдзяржуніверсітэта А.А.Лабкоў, актыў прафсаюзаў і студэнцкіх інтэрнатаў.*



## Весткі з галоўнага корпуса

Ва універсітэце вядзецца падрыхтоўка новага Статута БДУ. З гэтай мэтай была створана камісія ў складзе: Гайсёнак В.А., рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (старшыня камісіі); Паваляеў С.А., памочнік рэктара (адказны сакратар); Векша С.А., прарэктар; Аджаеў У.Б., нам.прарэктара па НДР; Рахманаў С.К., дырэктар НДІ ФХП; Дарашчонак П.Л., дэкан факультэта журналістыкі, Мулярчык С.Р., дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі; Яноўскі А.А., в.а. дэкана гістарычнага факультэта; Хухлындзіна Л.М., нам.дэкана факультэта міжнародных адносін; Крамнік А.М., заг.кафедры канстытуцыйнага права; Чэркас М.А., заг.кафедры нямецкай мовы; Сманцэр А.П., заг.кафедры педагогікі; Казак Т.М., рэдактар газеты "Беларускі універсітэт"; Варатніцкі Ю.І., кіраўнік інфармацыйна-выдавецкага і вылічальнага цэнтра; Самахвал В.В., начальнік вучэбна-метадычнага ўпраўлення; Клімковіч А.Д., начальнік аддзела кадраў; Багдановіч А.Б., начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю; Туромша Я.П., старшыня прафкама.

• • •

*З 12 па 19 лістапада народная харавая капэла Беларускага дзяржаўнага універсітэта прымала ўдзел у XIII міжнародным конкурсе акадэмічных хораў імя Франца Шуберта, які праходзіў у Вене (Аўстрыя). Са слоў відавочцаў, капэла годна прадставіла нашу рэспубліку на прэстыжным конкурсе.*

• • •

## Наш конкурс

## ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ

### конкурсу "Наш універсітэт", прысвечаны 75-годдзю БДУ.

***За лепшы артыкул з гісторыі універсітэта*:**

І прэмія — Аўсянік В.У., студэнтка 2-га курса факультэта журналістыкі ;

ІІ прэмія — Яноўскі А.А., дацэнт кафедры расійскай і славянскай гісторыі;

ІІІ прэмія — Шаблінская С.А., студэнтка 5-га курса факультэта журналістыкі.

***За лепшы нарыс на тэму "Універсітэт сёння":***

І прэмія — Каздзерка В.У., студэнтка 2-га курса факультэта журналістыкі;

ІІ прэмія — Салдзіна Л.А., студэнтка 5-га курса факультэта журналістыкі ;

ІІІ прэмія — Васілішына Ю.С., студэнтка 5-га курса факультэта журналістыкі .

***За лепшы мастацкі твор, прысвечаны БДУ:***

І прэмія — Шавялёў Дз.Л., студэнт 5-га курса факультэта міжнародных адносін, і Гарайнаў С.А., студэнт 1-га курса механіка-матэматычнага факультэта;

ІІ прэмія — Сярко А.В., студэнтка 5-га курса філалагічнага факультэта;

ІІІ прэмія — Лучыц А.А., студэнт 1-га курса механіка-матэматычнага факультэта, і Кавальчук А.К., студэнт 1-га курса механіка-матэматычнага факультэта.

***Просім ўсіх пераможцаў звярнуцца ў рэдакцыю для ўзгаднення арганізацыйных пытанняў.***

## Коратка

*29 лістапада адбылася справаздачна-выбарная канфэрэнцыя камітэта Беларускага Саюза моладзі Маскоўскага раёна сталіцы. Ад Белдзяржуніверсітэта на канферэнцыі прысутнічаў і выступіў П.Скалабан — сакратар камітэта БСМ універсітэта.*

Сакратаром Маскоўскага райкама БСМ Мінска была абраная М.М.Мосіна. Яна адзначыла, што падтрымка ініцыятываў студэнцкай моладзі БДУ будзе адным з галоўных накірункаў дзейнасці Маскоўскага райкама БСМ: так, налета плануецца надаць асаблівую ўвагу арганізацыі летніх лагероў працы і адпачынку на поўдні, правядзенню міжраёнаых і міжвузаўскіх спаборніцтваў камандаў КВЗ.


**Прапануем** папкі для дыпломных працаў коштам 75 тысяч рублёў. Звяртацца на адрас: БДПА, корпус 3, пакой 8 (або 8а), тэл. 232-80-91.


## У суседзяў

# Друзь шукаў інтэлектуалаў

Каюся, што 16 лістапада разам з калонай студэнтаў (каля 30 чалавек) я знесла "блокпост" у вестыбюлі галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. А пасля разам з калонай брала штурмам актавую залу гэтага ж будынку. Пры вынясенні прысуду прашу суд прысяжных прыняць да ўвагі змякчальныя абставіны — спяшался на сустрэчу з Аляксандрам Друзём і Юрыем Чэрушавым.

Усё пачалося з аб'явы, якая запрашала на сустрэчу з "зоркамі" тэлевізійных перадачаў "Брэйн-рынг", "Што? Дзе? Калі?" і "Свая гульня". Паташоў, Бялка, Бурда, Друзь, Чэрушаў, Левін, Цюрыкава — усе яны і мноства іншых заанансаваныя на прыезд у Мінск Беларускім саюзам моладзі і АТ "Спадарожнік". Аматары інтэлектуальных гульняў сталіцы 16 і 17 лістапада сустракаліся з Аляксандрам Друзём і Юрыем Чэрушавым.

16 лістапада. Цёмны чацвёрты паверх галоўнага корпуса Белдзяржуніверсітэта. Дзесяткі тры студэнтаў каля наглуха зачыненных дзвярэй залы. Хтосьці выказаў здагадку, што чакаем не там, і прапанаваў прагуляцца ў педуніверсітэт. Губляць не было чаго, і таму ніхто не пярэчыў. У вестыбюлі суседняй навучальнай установы нашаму "авангарду" шлях засланілі некалькі моцных хлапцоў, патрабуючы запрашэнне. Мы зразумелі, што прыйшлі куды трэба. Запрашэнняў ахоўнікі так і не пабачылі — у нас іх папросту не было. Пабачыўшы нашыя "асноўныя сілы", ахова ціха саступіла дарогу, баючыся быць змятай.

Напачатку Аляксандр Друзь расказаў кароткую гісторыю "Што? Дзе? Калі?", а Юрый Чэрушаў — "Сваёй гульні", потым яны разам з Валянцінай Голубевай адказвалі на запіскі. Пасля таго, як Аляксандр Друзь правёў інтэлектуальныя гульні з залай, усе ахвотныя атрымалі аўтографы і сфатаграфаваліся на памяць.

***У бліжэйшых нумарах "Беларускага універсітэта" плануецца інтэрв'ю з А.Друзём.***

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

## Наша здароўе

# НУ, ПАДУМАЕШ — УКОЛ!..

Памятаеце рэкламны ролік пад умоўнай назвай "Случилось страшное"? Прыблізна гэткімі словамі ацэньваюць сітуацыю ва універсітэце медыкі БДУ: на сённяшні дзень 1700 студэнтаў не прайшлі флюараграфічнае абследаванне і 1400 — прышчэпкі на ўсеагульную імунізацыю, скіраваныя на прадухіленне дыфтэрыі. Як паведаміла загадчыца здраўпункта В.В.Свіціна, дыфтэрыя, якой да 90-х гадоў у Беларусі практычна не было, пашыраецца ў нас следам за Расіяй і Украінай, дзе на пачатку дзесяцігоддзя прайшлі эпідэміі. У нашай краіне ўжо да сёлетняга мая ўзровень захворвання на дыфтэрыю перавысіў лічбу за два папярэднія гады. У сувязі з гэтым і пачала праводзіцца ўсеагульная імунізацыя супраць дыфтэрыі.

На жаль, не ўсе разумеюць неабходнасць такой меры. Стаўленне студэнтаў да працэдуры прышчэпак можна параўнаць хіба з сабатажам, у чым найбольш вызначаюцца студэнты юрфака.

*Паўлік РЫЛЕЙШЫН*

**P.S. Напэўна, лішне было б звяртацца да гэтай тэмы праз газету, каб не адна акалічнасць. Прыгледзьцеся, у якой антысанітарыі мы існуем. Асабліва добра пра гэта ведаюць студэнты, якія наведваюць прыбіральні фізфака і адзіную (!) на ўвесь корпус прыбіральню гістфака.**

**Ведай нашых!**

*У кастрычніку гэтага года выйшаў нулявы нумар французскамоўнай газеты “Planete des Hommes” (“Планета людзей”). Заснавальнік яе — студэнт II курса факультэта міжнародных адносін БДУ Андрэй Кляноўскі, асоба дастаткова неардынарная. Відавочна, што наша газета не магла прапусціць такой падзеі, таму ў Вас, паважаныя чытачы, ёсць магчымасць завочна пазнаёміцца з гэтым хлопцам.*

# “Planete des Hommes”

## *Кожны прыводзіць у парадак сваю планету*

*— Андрэй, сярод студэнтаў, якія вывучаюць французскую мову, Вы сталі амаль легендарнай асобай. Кажуць, што Вы скончылі школу экстэрнам недзе ў 15 год і адразу паступілі ў БДУ. Ці так гэта?*

— Так, сапраўды. У 10 класе я вырашыў паспрабаваць свае сілы: мяне вызвалілі ад заняткаў, і ў хуткім часе я здаў экзамены за 10 і 11 класы. Заадно атрымаў залаты медаль. Вялікая заслуга ў гэтым — маіх настаўнікаў, якія пасля заняткаў бясплатна аддавалі мне свой час і энергію.

*— А чаму Вы паступілі менавіта на гэты факультэт, на міжнародна-эканамічнае аддзяленне?*

— Справа ў тым, што я люблю замежную мову, гуманітарныя прадметы і матэматыку. Тут гэта чамусьці сумяшчаецца. Да таго ж мне падабаецца эканоміка: у ёй няма той аморфнасці, якая прысутнічае, напрыклад, у дыпламатыі.

*— Вы адразу, без ваганняў вырашылі паступаць сюды?*

— Так. Праўда, на гэтай глебе ўзніклі праблемы з бацькамі, якія раілі пайсці туды, дзе мне не трэба будзе здаваць экзамены.

*— Напрыклад?*

— Матфак, наргас, у які, на мой погляд, лягчэй здаць матэматыку. Дайшло да таго, што ў апошні момант хацелі нават, каб я забраў дакументы і падаў іх у іншае месца. Але я, у рэшце рэшт, дамогся, чаго хацеў.

*— Андрэй, Вы, мабыць, віртуоз у французскай мове?*

— Не лічу магчымым хваліцца добрым веданнем чагосьці.

*— Аднак, усё ж такі, наколькі добра Вы ёю валодаеце? Ці чытаеце Вы, напрыклад, кнігі па-французску?*

— Канешне, каб падтрымліваць свой узровень, мне проста неабходна гэта рабіць. Цікаўлюся аўдыя- і відэаматэрыяламі па-французску.

*— А я ўчора прыходзіла, і мне сказалі, што Вас “звычайна няма на гэтай пары”.*

— Магчыма... А на якой “гэтай”?

*— На занятках па французскай мове.*

— Сапраўды, я не хаджу: Мне здаецца, што я буду замінаць іншым студэнтам. Нашыя патрабаванні не сутыкаюцца, і гэта перашкаджае навучанню. У мяне свая методыка, і, займаючыся замежнай мовай самастойна, я бачу вынікі. Выкладчык мяне разумее.

*— А чаму Вы вырашылі адкрыць газету на французскай мове?*

— Яшчэ на першым курсе я хацеў зрабіць гэта, бо бачыў становішча з замежнай мовай у Беларусі. І мне здалося, такое выданне будзе падтрымкай не толькі для выкладчыкаў.

*— Андрэй, да каго давялося звяртацца?*

— Спачатку трэба атрымаць ліцэнзію ў Дзяржкамдруку і знайсці людзей, якія б маглі працаваць у газеце. У маім выпадку — тых, хто валодае французскай мовай і можа рэдагаваць матэрыялы, тых, хто будзе гэтыя матэрыялы шукаць, і, канешне, неабходны чалавек, які займаецца камп’ютэрнай вёрсткай. Патрэбныя дызайнеры і мастакі. Паступова збіраецца калектыў. Вядома, існуе шмат праблемаў... У першую чаргу, звязаныя з нашымі бюракратычнымі структурамі. Іх не вельмі хвалюе развіццю культуры ў дзяржаве, яны больш цікавяцца сваімі праблемамі. Гэта не выносіцца на паверхню, але сапраўды ёсць шмат людзей, незадаволеных выхадам нашай газеты па той простай прычыне, што яны не могуць “пагрэць” на гэтым рукі. Нягледзячы на ўсё адмоўнае, газета ўсё ж выйшла дзякуючы нашаму калектыву, настаўнікам, таварыству “Беларусь-Францыя” і французскаму пасольству.

*— Чаму Ваша газета называецца менавіта так?*

— “Планета людзей” — газета культуры. Яна створана на карысць людзям. Недарма мы ўзялі эпіграфам да яе словы Антуана дэ Сент-Экзюперы, якія гучаць прыкладна так: “Устаўшы раніцай, неабходна памыцца, прывесці сябе да ладу, а затым прывесці да ладу сваю планету”. Гэта і дэвіз нашай дзейнасці.

*— Як адрэагавалі хлопцы, з якімі Вы вучыцеся, на такую дзейнасць?*

— Добра, павіншавалі.

*— А антыпатыі да Вас ні ў кога не ўзнікла?*

— Ой, гэта асобная праблема... Аташэ па культуры пасольства Францыі выказаў сваю адмоўную рэакцыю. Магчыма, мы усталі ў яго на дарозе ці перашкодзілі ў нейкіх іншых справах. Я думаю, французы памыліліся, паслаўшы ў Беларусь такога чалавека. Існуюць, канешне, і іншыя нядобразычліўцы. Але мы не засяроджваем на гэтым увагу.

*— Колькі каштуе ваша газета, калі выходзіць?*

— Плануем выпускаць яе раз на месяц. Хутка выйдзе першы нумар. Ён, як і папярэдні, будзе каштаваць пяць тысяч. У ім мы прапануем падпісны бюлетэнь на першыя тры месяцы 1997 года па тым жа кошце (усяго 15 тысяч). Калі наступныя нумары будуць каштаваць даражэй — выгадней падпісацца.

*— Дзякуй, зычу Вам далейшых поспехаў!*

*Валерыя АЎСЯНІК*

**ДАІ паведамляе**

*Восень — цяжкая пара для вадзіцеляў і пешаходаў: рана цямнее, ускладняюць рух дажджы, туманы, снег. За 10 месяцаў гэтага года ў Мінску адбылося 621 дарожна-транспартнае здарэнне, пры гэтым загінулі 77, параненыя 649 чалавек.*

*Сярод парушальнікаў правілаў дарожнага руху — студэнты БДУ Вухаў А., Панамароў Ю., Альфёраў С., вядучы супрацоўнік Янкоўскі Д.*

*Паважаныя супрацоўнікі і студэнты БДУ! Восеньскае надвор’е яшчэ больш павышае патрабаванне да ўдзельнікаў дарожнага руху заўсёды выконваць правілы. Ад Вашай дысцыпліны на дарозе залежыць Вашае жыццё.*

*А. КУДРАЎЦАЎ, дзяржаўтаінспектар ДАІ Маскоўскага раёна*

**Выставы**



## *Падарункі ад Гаспадыні Меднай гары і расійскага майстра*

З 29 лістапада па 1 снежня ў корпусе геаграфічнага факультэта праходзіла VI Міжнародная мінералагічная выстава-кірмаш “Каменная казка”. У выставе прымалі ўдзел больш за 40 экспанентаў — ювеліраў Беларусі, Расіі, Украіны.

Сердалік, агат, бліскучы дыямент, мігатлівы апал, біруза — гэтыя таямнічыя творы прыроды здаўна вабяць і чаруюць. Калісьці антычны прыродазнаўца Пліній Старэйшы заўважыў, што многім людзям для найвышэйшага і дасканалага сузірання прыроды даволі аднаго каштоўнага каменя. Сапраўды, гэта так. Нездарма вакол каштоўных камянёў складаліся легенды і паданні. Выстава-кірмаш “Каменная казка” прапанавала сваім наведвальнікам ювелірныя ўпрыгожанні з натуральных камянёў, падарункі, сувеніры, калекцыйныя ўзоры. Акрамя таго, тут жа можна было атрымаць кансультацыю, вызначыць натуральнасць каменя, яго назву.

У дзейнасці выставы, прысвечанай 75-годдзю універсітэта, браў удзел вядомы расійскі мастак Альберт Сяржант. Да юбілейнай даты майстар падарыў Белдзяржуніверсітэту свой твор.

**Весткі з бібліятэкі**

# І.І.Насовіч і яго “Слоўнік беларускай мовы”

Больш за 100 гадоў прамінула з таго часу, як выйшла ў свет гэтая цудоўная кніга. За гэты доўгі час нямала складзена і выдадзена слоўнікаў, але мы з вялікай пашанай звяртаемся да першага, экземпляр якога захоўваецца ў аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі фундаментальнай бібліятэкі БДУ.

Аўтар гэтага слоўніка — беларускі лексікограф, этнограф, фалькларыст Іван Іванавіч Насовіч, які нарадзіўся ў 1788 годзе на Магілёўшчыне. Адукацыю ён атрымаў у Магілёўскай духоўнай семінарыі, пасля чаго настаўнічаў у многіх гарадах Беларусі (Мсціслаўскім і Аршанскім павятовых вучылішчах, Маладзечанскім і Свянцянскім дваранскіх вучылішчах). У 1844 годзе І.І.Насовіч выйшаў у адстаўку, пераехаў у Мсціслаў і займаўся даследчай дзейнасцю ў галіне філалогіі да сваёй смерці ў 1877 годзе.

Шмат гадоў давялося патраціць даследчыку на збіранне матэрыялаў для “Слоўніка беларускай мовы”. Добры плён у яго цікавай і нялёгкай працы далі назіранні над беларускай мовай, веданне народнага жыцця, вывучэнне фальклору, побыту.

“Слоўнік беларускай мовы” быў надрукаваны пры жыцці аўтара ў 1870 годзе ў Санкт-Пецярбургу друкарняй Імператарскай Акадэміі навук. Гэта аб’ёмістая кніга, якая змяшчае каля 30 тысячаў слоў. Значнасць гэтага выдання палягае не толькі ў ягоным змесце, але і ў элементах кніжнай атрыбутыкі, змешчаных у ім. Экземпляр, які захоўваецца ў аддзеле рэдкай кнігі, мае аўтограф, экслібрысы, бібліятэчныя штампы і розныя паметы, што характарызуе выданне з розных бакоў і ўяўляе асаблівую цікавасць для кнігазнаўцаў, бібліёграфаў, журналістаў.

На адвароце тытульнага аркуша размешчаны аўтограф-дыялог І.І.Насовіча ў форме адказу аўтара вядомаму славісту-мовазнаўцу І.І.Сразнеўскаму, які рабіў рэцэнзію на гэты твор і папракаў яго ў паланізмах. На адвароце вокладкі знаходзіцца сюжэтны экслібрыс, выкананы П.Граноўскім: рабочы кабінет, пісьмовы стол і паліца з кнігамі, вакол рамкі — дрымучы лес. Тут жа намаляваныя жанчына і мужчына ў час палявання на дзікіх звяроў. На тытульным аркушы і шмуцтытуле ёсць штамп з указаннем “Бібліятэка С.Л.Драздова № 644”.

Мяркуючы па ўсіх гэтых паметах, можна ўявіць сабе шлях слоўніка. Нейкі час ён, мусіць, знаходзіўся ў бібліятэцы самога аўтара ці рэцэнзента, пра што сведчыць аўтограф. Потым слоўнік захоўваўся ў бібліятэцы С.Л.Драздова, а сёння ён знаходзіцца ў аддзеле каштоўнай кнігі бібліятэкі БДУ (пра што сведчаць два штампы бібліятэкі, адзін з якіх — даваенны).

У розныя часы гэтая кніга служыла для розных патрэбаў, але найперш — як цікавы матэрыял для навукова-даследчай працы мовазнаўцаў, фалькларыстаў, этнографаў.

Выхад слоўніка ў 1870 годзе стаў вялікай падзеяй ў культурным жыцці Беларусі.

Але акрамя слоўніка І.І.Насовічам былі напісаныя “Зборнік беларускіх прыказак” (1867 г.), зборнік “Беларускія песні” (1873 г.), адзін экземпляр якога захоўваецца ў аддзеле рэдкай кнігі універсітэта. Ёсць у І.І.Насовіча і ненадрукаваныя працы.

Імператарская Акадэмія Навук неаднаразова ўзнагароджвала навукоўца Увараўскай, Дзямідаўскай прэміямі. Рускае геаграфічнае таварыства прысудзіла Насовічу залаты медаль і выбрала членам таварыства.

Сёння беларуская грамадскасць не забывае ўшаноўваць памяць выдатнага фалькларыста, этнографа І.І.Насовіча. Так, у 1983 годзе выдавецтва “Беларуская савецкая энцыклапедыя” факсімільна ўзнавіла “Слоўнік беларускай мовы” тыражом у тысячу экземпляраў. А ў 1988 годзе адзначалася 200-годдзе з дня нараджэння аўтара гэтай кнігі.

*Л.П.МІЦКЕВІЧ, загадчыца аддзела рэдкай кнігі*

Турніры

# "Карты-карцішкі кінулі веерам..."

Сярод інтэлектуалаў Мінска прайшлі чуткі, што 11 лістапада адбудзецца жараб'ёўка адкрытага турніру БДПА па прэферансу "Легіён-96". Я звярнулася да кіраўніцтва картачнага клуба "акадэмікаў" — Германа Панчанкава і Міхаіла Свістунова. Прозвішча першага мне здалося да болю знаёмым, але часу на ўспамін мне не далі. З-за дзвярэй данесліся раскацісты смех, пастукванне малатка і эратычнае квакание. Уваходжу. Да сённяшняга дня не магу ўцяміць, на каго ў той момант я больш была падобная: на рэвізора ці на прывід. Але за тое, што мяне прынялі не за супрацоўніка сродкаў масавай інфармацыі, я магу паручыцца. Азіраюся, пакуль гаспадары стаяць у неверагодных позах. Чалавека са знаёмым прозвішчам вочы адшукалі адразу, а ў памяці аднавілася карціна з кубка "Несцеркі" па брэйн-рынгу, дзе "Легіён" з капітанам Германам Панчанкавым выбіў з барацьбы апошнюю надзею нашага універсітэта каманду "БДУ". Секундаў праз 15 здзіўленне прайшло, і мы пазнаёміліся. Герман папрасіў прабачэння за рамонт і на маё пытанне пра кваканне адказаў, што так забаўляецца адзін з мясцовых жартаўнікоў. Невядома адкуль з'явіліся некалькі непаламаных крэслаў, і мая рука машынальна нырнула ў сумачку за нататнікам.



***Заўвагі з нататніка студэнткі факультэта журналістыкі***

З дзяцінства ўбівалі ў нашыя галовы, што карты — нешта дрэннае, што ў іх гуляюць толькі п'янчугі, седзячы ў двары з бутэлькай гарэлкі, ці двоечнікі на апошніх партах у школе. Давайце зірнем на гэтую з'яву з іншага боку: гуляць можна, фіксуючы кожную "засвечаную" карту, кожны казыр, але для гэтага трэба мець добрую памяць і лагічнае мысленне.

Спадзяюся, я хоць крышачку вас пераканала, што інтэлектуальныя картачныя гульні — гэта не толькі добра, але і карысна. Таму нічога дзіўнага, што турнір "Легіён-96" праводзіцца картачным клубам "Легіён" пры падтрымцы Беларускага саюза моладзі. Планавалася, што 36 ігракоў на працягу 4 дзён будуць спрачацца за права называцца лепшым прэферансістам БДПА. Пераможцам дастануцца памятныя падарункі, арганізаваныя БСМ.

"Легіён-96" — першая ластаўка, дасюль нічога падобнага ў політэхнічнай акадэміі не адбывалася. Таму ў ім удзельнічае такая невялікая колькасць людзей. Аднак, паколькі турнір адкрыты, у ім удзельнічаюць і студэнты фізфака Белдзяржуніверсітэта Аляксей Іваноў і Міхаіл Янцікаў. У выпадку ўдачы мерапрыемства картачны клуб "Легіён" мяркуе правесці больш маштабны турнір недзе ў сакавіку наступнага года...

Гульні пачаліся 13 лістапада пад наглядам галоўнага суддзі Міхаіла Свістунова. У першы ж дзень выбыў студэнт нашага універсітэта Міша Янцікаў. А вось Аляксей Іваноў адразу ж вырваўся наперад. З гаспадароў-"легіянераў" у другі тур з найвялікшымі намаганнямі змог выйсці толькі Віталь Зубок.

Другі тур атрымаўся больш напружаным і цікавым. Наш Аляксей Іваноў ізноў пераможа з вялікім адрывам. У гэтым жа туры датэрмінова склаў карты апошні "легіянер" Віталь Зубок. У 19.00 памяшканне мусіла быць закрытым, але стрэлкі гадзінніка набліжаліся да сямі, а гульня за двума сталамі і не думала скончвацца. Давялося галоўнаму суддзі спыняць яе сваёй уладай.

Паўфіналы пераехалі з памяшкання турыстычнага клуба спорткомплексу БДПА ва ўжо знаёмую нам "рэзідэнцыю" картачнага клуба "Легіён". Гэты пераезд, відавочна, разняволіў хлопцаў, і паміж сталамі пачуліся жарты...

Дату фіналу прызначылі амаль праз тыдзень — 21 лістапада ў "Легіёне". Але для яго правядзення была спатрэбілася адна маленькая рэч, якой не аказалася ні ў каго з "легіянераў", што тоўпіліся ў калідоры. Гэтай рэччу быў ключ ад дзвярэй клуба. Запозненнае з'яўленне Міхаіла Свістунова, у якога і быў ключ, уратавала для політэхнічнай акадэміі сценку, у якой Аляксей Іваноў ужо мецімся сваім магутным плячом зрабіць дзвярны праём...

У фінале першым быў Ігар Моткін, другім — Юрый Кукуй, трэцім — Віталь Касцюковіч і толькі чацвёртым — наш Аляксей Іваноў. Але ўзнагароджанне адбылося толькі на наступны дзень, бо намеснік сакратара БСМ БДПА Яўген Скібскі, у якога і былі прызы, знік кудысьці ў сярэдзіне фіналу, і адшукаць яго не змог ніхто. Пераможца атрымаў радыёпрыёмнік, другі фіналіст — фотаапарат, а трэці — гадзіннік.

***Вольга КАЗДЗЕРКА***

*P.S.* Аўтар артыкула дзякуе Вадзіму Гапіенку, Дзмітрыю Чэху і Дзянісу Шапёлкіну, а таксама настаўніку па прэферансу Віталю Зубку.

Юбілеі

## *Віншуем!*

***Віншуем*** усіх з пачаткам каляндарнай зімы. Дарэчы, ў 1921 годзе спецыяльныя брыгады са студэнтаў накіроўваліся для падрыхтоўкі дровай дзеля ацяплення інтэрната і навучальных аўдыторыяў. Актуальна?!

***Віншуем*** аматараў мастацтва з адкрыццём 6 снежня 1925 года ў памяшканні БДУ I Усебеларускай мастацкай выставы.

***Віншуем*** высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых супрацоўнікаў, а таксама ўсіх, хто выконвае сацыялістычныя абавязкі, з узнагароджаннем БДУ Памятным Чырвоным сцягам у 1968 годзе. Дарэчы, віншавалі нас з 50-годдзем БССР і КПБ. А чаму зараз нас не віншуюць яшчэ з чымі-нібудзь юбілеямі?..

***Віншуем*** палітычна скіраваную моладзь з тым, што 7-12 снежня 1970 года ў БДУ праходзіў семінар сакратароў маладзёжных арганізацыяў ВНУ сацыялістычных краінаў па пытаннях ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў. Усе сцягі будуць у госці да нас?..



***Віншуем*** факультэт журналістыкі з 25-годдзем ад пачатку выхаду першых навучальных тэлеперадачаў. Чым парадуеце сёння?

Гасцёўня

# *"НЕЛЬГА ХАЦЕЦЬ АБО НЕ ХАЦЕЦЬ СТАЦЬ ПАЭТАМ"*

***У мінулым нумары мы пазнаёмілі чытачоў з вершамі Ліі Іёвіч (на вялікі жаль, пры публікацыі ў напісанні прозвішча была дапушчана памылка). Сёння рэдакцыя "Беларускага універсітэта" прапануе невялікае інтэрв'ю з Ліяй і некалькі ейных вершаў.***

***— Лія, Вы сачыняеце вершы з 5 год, упершыню ўсвядомілі іх чытэльнасць у 14 год. Ці друкаваліся дзе-небудзь Вашы творы?***

— У рэдакцыю са сваімі вершамі я не прыходзіла. Былі, як і ва ўсялякага чалавека, думкі кшталту "не дрэнна было б"... Але я лічу, што не маю права загрувашчваць вершамі і без таго перапоўненыя ўсялякім шалупіннем паліцы. Праўда, была публікацыя ў 1995 годзе ў "Такой жизни", якая адбылася дзякуючы літкансультанту Канстанціну Міхееву.

***— Не заўважыць гэтыя вершы нельга. Аднак Вы не хочаце лічыць сябе паэтам.***

— Таму што я бачу сваё прызначэнне ў якасці жанчыны. Я хачу свой інтэлект, свае душэўныя якасці ўскласці на алтар кахання, маёй веры ў каханага чалавека. У гэтым для мяне — вартасць жыцця.

***— Вы не хочаце быць паэтам...***

— Нельга хацець або не хацець стаць паэтам. Можна проста магчы ці не магчы. А стаць паэтам — гэта мала залежыць ад асобы, гэта болей залежыць ад таго, што звычайна называюць Богам.

***— Якія пісьменнікі і паэты найбольш блізкія Вам?***

— Я крыху інакш гляджу на літаратурны працэс і на літаратуру. Для мяне існуе толькі адна грамадная маса, якая называецца "літаратурны тэкст", ён амаль увесь варты ўвагі. Але захапляцца даводзіцца толькі асобнымі старонкамі: сюды можа ўваходзіць шумерскі эпас, кніга Іёва, Эклезіяст, Песня песень, "Злачынства і пакаранне", "Браты Карамазавы", "Зорны жах" М.Гумілёва і г.д.

***— А Вашыя пераклады Эдгара По?***

— Іх усяго дванаццаць, гэта разавая спроба. Пераклад — гэта больш сур'ёзная, больш прафесійная работа, чым напісанне ўласных вершаў. Дый больш карысная, бо яшчэ адзін пераклад ніколі не перашкодзіць. Гэта цікава, таму што з'яўляецца яшчэ адна грань бачання паэтычнага тэкста.

***— Ведаеце, Вы зусім не робіце ўражання чалавека, які пакутуе на комплекс незразуметасці, неацэненасці, што не стасуецца з Вашымі вершамі...***

— У сэнсе гарызантальных дачыненняў са светам я лічу сябе чалавекам поўнасцю самадастатковым. Мая пэўная самота — свабодная і не абцяжарвае мяне. Кожны чалавек — самотны, і ў гэтым ёсць доля аптымізму.

У вертыкальных адносінах я адчуваю моцную душэўную повязь з маімі продкамі-дзекабрыстамі, а таксама пэўную сакральную суаднесенасць з біблейскім прарокам Іёвам. Тут можна нават пажартаваць з нагоды паходжання майго прозвішча...

***Гутарыла Кацярына ТКАЧЭНКА***

## Рисунки на обоях

В мертво-белом небостреле
Елей вылеплены стрелы —
Еле-еле канителью,
Чтобы в дело не впестрели.
В дело медленных сомнений,
В дело мнительных велений,
В дело вяленых томлений
Обомлелость впечатлелась.
Смерклось. Стены побледнели,
Цвета мела светом тлеют,
Растлевают малолетне,
Мимолетно, столбенело
Лба дебелые паннели.
Веки леви-медитаций,
Если б в млекость колыбели,
На слепление постели —
Если бы не села муха...

### 2

В жидком стекле,
расплавленном в солнце,
два аиста белых
лежат, распластавшись,
третий, круги расширяя и множа,
в полдне не тонет
и в синь не всплывает.
Встретившись клювом
с прохладной стекляшкой,
клёкотом ритмы
выстукивать начал:
ближе подходит к границам вселенной —
где пресекаются небо и поле,
где начинается тело любимой,
гибкую шею
женский высокий
крик продырявил, вбитый ударом
хриплога мата.

### 3
### Лифт, или О любви

Как любознательно
И дружелюбно,
Жаждет общения,
Отзывчиво и чутко,
Доброжелательно до альтруизма
Нечто человечество в общем и целом.
И как безумна,
Остро направлена,
Болезненно взвинчена
До онемения пальцев
Любовь к крошечной царапине на стенке —
Скользкой и легкой на лопатках стенке,—
К царапине чуть выше плеча напротив,
Правее щеки,
А лучше не видеть —
Когда две особи деятельной массы
Переживают три с половиной секунды
(Идущие год за бесконечность),
Помещенные в тесную кабину лифта,
Где дрожание зрачка
Почитается за измену
Магическому знаку.
О статическая страсть
К магнетическому пункту!

P.S.
Если же ты
Обыкновенный смертный
И чувствуешь ближнего
Посредством рецепторов собственных капризов,
И если пришлось подниматься в кабине
С незнакомым комплексом чьих-то желаний,
И ежели ты не обучен молитвам,
И мозг из учтивости
Готов и незанят,
Читай эти строчки,
Пока дверцы лифта
Не вытолкнут сердце,
Вздохнув с облегчением,
Напором свободы
На твоём этаже.

### 4
### Приготовление к разлуке

Станок продирает войлок —
Очистки сползают мылко,—
Стирая серо и знойно
От темени до затылка.

Крапит, срезая головки,
Чуть красным на зеленоватом —
На площади остановки
Сожрется граница ватой.

Не бойся за пол девичий,
За то, что психически больно;
Болезненней было бы спичкой
И проблематично довольно.

А волосы станут гуще:
Начнем на ночь мазать луком.
Что может быть в мире груще
Свидания бритвы с мукой?

### 5
### Крылья

Я помню сон или не сон:
Полоски шкуры или крылья
Коричневым, чуть с фиолетовым,
Мешают взгляду;
Лоб навис
И будто веки
Или кожа
С висков —
И вздернутая на кулисах
Или под тяжестью своей
Поскрипывает косточка души;
Она лежит свинцовой каплей в рюмке,
Продавливает мякоть коньяка;
Вверху предполагается звезда
Или свечение,
Ну, что-нибудь святое;
Но череп так тяжел,
Что видишь только ткани,—
Тягучие, как белый стих,
Оформленные, как сонеты:
Не то взлетаешь ты на них —
Не то карабкаешься к свету.

*Падзеі, адлюстраваныя ў апавяданні ніколі не мелі месца ў жыцці, і ўсе супадзенні чыста выпадковыя.*



*Аўтар апавядання*

# Гульня на дваіх

У вестыбюлі галоўнага корпуса ля дошкі аб'яў сабралася кучка хлопцаў. Бачна, што студэнты штосьці абмяркоўваюць, пра штосьці спрачаюцца. Цікава, што магло так вывесці міралюбівых студэнтаў, што яны пераблыталі універсітэт з рынкам? Аб'ява. Так-так, простая аб'ява, якая абвяшчае, што да 75-годдзя БДУ будзе праведзены чэмпіянат універсітэта па брэйн-рынгу. Кожны з трынаццаці факультэтаў павінен выставіць студэнцкую каманду інтэлектуалаў, да якіх далучаецца тры каманды, складзеных з выкладчыкаў. А напярэдадні любых спаборніцтваў няшмат знойдзецца людзей, якія ўтрымаюцца ад прагнозаў. Так здарылася і ў нашым выпадку. Ля дошкі аб'яў разгудзеліся знаўцы мясцовых каманд.

— Дык усё ж "Ахіл" ці "Карсіканец"?— ужо ў каторы раз спытаў невысокі чарнявы хлопец.

— Колькі можна паўтараць, што мацней за "Карсіканца" каманды ў БДУ няма,— ніяк не мог даказаць сваёй праўды прыхільнік "Карсіканца" Ігар Лаваш.

— Чуеш, хлопча, ты запамятаваў, што капітан "Ахіла", Лёшка Карнілаў,— лепшы кнопачнік у беларускай лізе, а ў Максімкі Аксенчанкі не галава, а Дом ураду,-- не здаваўся апанент Лаваша.

Невядома, колькі б працягвалася гэтая спрэчка, калі б Міхаіл Крот не схапіў Лаваша за рукаў:

— Хопіць крычаць, размова ёсць.

Міша Крот і Ігар Лаваш — прыяцелі-сакурснікі. Іх не вельмі любілі на курсе, бо чамусьці не давяралі затоенай усмешцы і няслынным вочкам Крата і развязанасці Лаваша.

— І навошта ты так крычаў у вестыбюлі?— запытаў Крот, прыкрываючы дзверы.

— Ты ведаеш, гэты хлапчук мае рацыю,— задумліва прамовіў Лаваш.— "Ахіл" выйграе. Яны мацней, што і казаць. У нашых амаль няма шансаў.

— Ігар, ты добра ведаеш, што існуе такое паняцце, як ахілесава пята, і наша задача — знайсці яе ў журналістаў.

— Дык ты пра гэта хацеў пагутарыць,— здзівіўся Лаваш.— Ты дарэмна губляеш час. Што мы можам зрабіць, акрамя як падсунуць нашым правільныя адказы?

— Ты мяне не разумееш. Нам трэба знайсці слабое месца журфакаўцаў.

— Ты ў сваім розуме? Там адзін Аксенчанка "Кітай-горад" перайграе,— пачаў ужо выходзіць з сябе Лаваш.

— А калі яго не будзе?...

— Слухай, Міша, ты мяне ўжо "дастаў". Зараз пайду і пастаўлю свечку Міколу Угодніку, каб Максімка заўтра ўвесь дзень у ліфце прасядзеў ці каб у яго гімназіі былі тры міністэрскіх кантрольных па дзве гадзіны кожная.

Крот ажно падскочыў на месцы і кінуўся паляпваць Лаваша па плячу, прыгаворваючы:

— Малайчына, Ігар. Гімназія! Малайчына!— і не разлічыўшы сілы, штурхануў сябра так, што той паляцеў са стула.

— Ты звар'яцеў, ці якое ліха!— зароў Лаваш, расцягнуўшыся на падлозе.

— Ды не крычы,— шапнуў Крот.— Максімка не студэнт БДУ, ён яшчэ вучань. Узгадай умовы турніру.

На твары Лаваша раптам з'явілася ўсмешка:

— За каманды БДУ маюць права гуляць толькі студэнты універсітэта... Вось яна, ахілесава пята. Бяжым хутчэй у арганізацыйны камітэт.

— Стой,— Крот схапіў сябра за рукаў.— Я хачу знішчыць не столькі "Ахіла", колькі яго капітана. Знойдзем Карнілава і, сказаўшы, што нам усё вядома пра Аксенчанку, параім ці не ставіць яго на гульні, ці тройчы прайграць кнопку нашаму капітану.

— Гэта Лёшка Карнілаў прайграе кнопку?!— Лаваш зарагатаў так, што зазвінелі шыбы.— Ты сёння галавой нідзе не цюкнуўся? А можа, у цябе тэмпература? Дык я хуценька на Бабруйскую злётаю па гэты... як яго...UPSA.

— Хопіць рагатаць, як конь,— раззлаваўся Крот.— У яго няма выбару. Адзінае выйсце для яго будзе — пакінуць каманду. Няцяжка ўявіць, як адрэагуюць хлопцы, калі даведаюцца, што за паўгадзіны да гульні яны засталіся без капітана. А "Ахіл" нават з Аксенчанкам, але без Карнілава няшмат варты. А калі ён не згодзіцца нам дапамагчы, то пра іхняга Максімку ўведаюць арганізатары адразу пасля перамогі "Ахіла" над "Карсіканцам".

## 2

Вячэрні Мінск — адно з найпрыгажэйшых відовішчаў. Аднак Аляксей Карнілаў, які паціху крочыў дадому, не заўважаў прыгажосці роднага горада. Усе думкі юнака займала размова з Кратом.

— Зняць Максімку!— абурыўся Аляксей.— Хлопец так чакае гэтага турніру. Сёння нават задумаў, што калі стане чэмпіёнам, то ўлетку абавязкова паступіць на юрфак.

Максімка Аксенчанка маладзейшы за іншых "ахілаўцаў" гадоў на пяць. Яго ўсе любілі за шчырасць, за тое, што ён заставаўся маленькім хлопчыкам і адначасова ніколі не губляўся ў экстрэмальных абставінах.

— Тройчы прайграць кнопку — яшчэ лепш,— працягваў шукаць выйсце Карнілаў.— Каб гэта датычылася толькі мяне...

Варожасць паміж Кратом і Карнілавым цягнулася пяць гадоў. Хаця калісьці ў школе яны сядзелі за адной партай, нават лічыліся прыяцелямі. Але і адзін, і другі — па сваёй натуры лідэры. А Крот заўсёды знаходзіўся ў ценю больш неардынарнага Карнілава. І пасля аднаго выпадку ён пакляўся затаптаць свайго тады яшчэ аднакласніка ў бруд.

Мішу не давала спаць слава Казановы, але яму з дзяўчатамі чамусьці не вельмі шанцавала. А Аляксей Карнілаў, наадварот, меў поспех у мясцовых прыгажуняў. Аднойчы хлопцы пазнаёміліся з дзяўчынай, якая запала ў душу Крату, але... выбрала Алёшу. Крот запісаў аднакласніка ў лік сваіх смяротных ворагаў, калі той расстаўся з Марыяй (так звалі дзяўчыну): ён не захацеў пакінуць дзеля яе некалькі сваіх знаёмых, а яна не змагла быць адной з яго дзяўчат.

Карнілаў добра ведаў, у чым прычына нянавісці Крата.

— Хлопцы не павінны нічога ведаць,— пачаў ужо ўголас размаўляць сам з сабой Аляксей.— Але павінна быць выйсце. Мішу патрэбен я, а не "Ахіл"...

Ён шпарка падыйшоў да таксафона, зняў трубку і набраў нумар.

## 3

"Ахіл" тоўпіўся ў вестыбюлі галоўнага корпуса, чакаючы капітана. Каманда расхвалявалася не на жарт: капітан спазняўся ўжо больш як на 40 хвілінаў.

— Можа, што здарылася?— Сцяпан Курловіч першым выказаў уголас думку, што не давала спакою ўсім.

Аляксей увайшоў у галоўны корпус. Рухі яго былі парывістымі, твар — бледным, вочы — вінаватымі. І толькі па цвёрдай паходцы "ахілаўцы" пазналі свайго капітана.

— Хлопцы, не разбягайцеся — мне з вамі пагаварыць трэба,— затрымаў ён каманду, якая ўжо рванулася да лесвіцы.

"Ахілаўцы" аслупянелі: замест каманднай формы на Аляксеі быў шэры касцюм.

— Сябры мае, не ведаю з чаго пачаць... Карацей, сёння вы гуляеце без мяне. Толькі, дзеля святых, не распытвайце — чаму.

Пяць пар вачэй свідравалі Карнілава. У гэтую хвіліну ён маліўся, каб яму нічога не сказаў Максімка.

— Сцяпанка, прымай каманду,— ціха прамовіў Карнілаў Курловічу.

"Ахіл" гуляў чацвёртай парай з камандай "Дубовы гай" з біяфака. І "ахілаўцы", і біёлагі занялі свае месца на сцэне — Карнілаў застаўся ў зале. Ён увесь час гіпнатызаваў Сцяпана, які вельмі хваляваўся.

— Увага! Пачынаем,— заклікаў залу да цішыні вядучы.— Першае пытанне! Навошта курапаткі ў цёплы ціхі дзень выходзяць на вольнае месца і заміраюць з адкрытым ротам?

— Каб злавіць мошак,— ціха прамовіў Карнілаў. У яго палягчэла на сэрцы, калі Сцяпан выйграў кнопку.

— Дзеля вентыляцыі,— даў адказ "Ахіл".

Аляксей застыў ад нечаканасці. Пабачыўшы твар капітана, Сцяпан зразумеў, што памыліўся. Але, на шчасце журналістаў, пытанне не паддалося і біёлагам.

— Другі раўнд, разыгрываем два ачкі,— спыніў вядучы ажыўленае абмеркаванне.— Адна савецкая актрыса. якая вельмі дрэнна ведала англійскую мову, згубілася ў Лондане. Яна знайшла паліцэйскага, што яна запытала?

— Do you speak English? (Ці гаворыце Вы па-англійску?) — у думках падказваў хлопцам Карнілаў.

У "Ахіла" было дзве версіі, і капітану, які выйграў кнопку, трэба выбраць адну. Але... якую?

— Адказвае,— нарэшце прамовіў Курловіч, расцягваючы словы,— Сяргей Глазкоў.

— Мы лічым,— пачаў Глазкоў,— што актрыса запытала: "To be or not to be?" (Быць ці не быць?)

Як дакараў сябе ў гэты момант Аляксей. Як можна не выйграваць такія пытанні! Але біёлагі, дзякуй богу, зноў не пакаралі журналістаў: 0-0. На ўсе сто ў сваіх сілах быў упэўнены толькі Максімка.

— Трэцяе пытанне, на кану тры ачкі. Цішэй у зале,— хваляванне камандаў перадалося і вядучаму.— Які летапісны горад знаходзіўся ў вусці рэчкі Нямігі?

У гэты час Максімка выгукнуў правільны адказ Сцяпану, але зрабіў гэта так гучна, што той не пачуў сірэны. "Дубовы гай" атрымаў права на адказ. Сцёпа зняў пальцы з кнопкі, нібы яна яго апаліла, і з дзіцячым непаразуменнем агледзеў залу. Усе сціхлі. Карнілаў, здавалася, страціў сувязь з рэальнасцю...

— Менеск,— узрадавана сказалі біёлагі.

Зала выбухнула, але вядучы падняў руку:

— "Ахіл" мае 30 секундаў на абмеркаванне.

Максімка вырваў мікрафон у Курловіча і крыкнуў так, што ў многіх заклала вушы:

— Няміга!!!

— Перамог "Ахіл": 3-0.

"Ахілаўцы" саскочылі ў залу і пачалі качаць Аляксея разам з Максімкам. Крот апусціў галаву: яму здавалася, што ён аслеп. Узняўшы вочы, ён мярцвячым позіркам глянуў на супернікаў. Толькі зараз ён зразумеў фразу класіка: "Народжаны поўзаць лятаць не можа".

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

*Аляксандр ЗОТАЎ*

## *Залік*

*Прафесар:* — Заходзьце, не саромейцеся. Вучылі?
*1-шы студэнт:* — В-вучыў...
*Прафесар:* — Уважліва слухаю.
*1-шы студэнт:* — Значыць... так... Э-э...
*Прафесар:* — У-у... Незалік. Наступны!.. Вучылі?
*2-гі студэнт:* — Вучыў... Усё вучыў!
*Прафесар:* — Усё?! Усё нават я не вывучыў бы! Незалік. Наступны... Знаёмы з прадметам?
*3-ці студэнт:* — Ушчыльную.
*Прафесар:* — Наколькі і з чым?
*3-ці студэнт:* — Ды са студэнткай з паралельнага патоку!
*Прафесар:* — І як... яна?
*3-ці студэнт:* — Усё ведае, праверана.
*Прафесар:* — Залік. Наступны. Усё ведаеце?
*4-ты студэнт:* — З крыніц!
*Прафесар:* — Калі не сакрэт, з якіх?
*4-ты студэнт:* — Якія сакрэты — пра гэта ўвесь інстытут ведае!
*Прафесар:* — Не стамляйце, вельмі прашу!
*4-ты студэнт:* — З вашых, прафесар!
*Прафесар:* — Пахвальна! Залік. Наступны. Што скажаце?
*5-ты студэнт:* — Добры дзень!
*Прафесар:* — Добры дзень. А што яшчэ скажаце?
*5-ты студэнт:* — Што спытаеце.
*Прафесар:* — А што спытаць?
*5-ты студэнт:* — Дзе вы былі ўчора з выкладчыцай псіхалогіі.
*Прафесар:* — Шантажыст.
Залік. Наступны. Чым жадаеце падзяліцца?
*6-ты студэнт:* — Коньяком... з выключна добрым чалавекам!
*Прафесар:* — А калі я выключна нядобры?
*6-ты студэнт:* — Вы памыляецеся!
*Прафесар:* — Прыйдзецца згадзіцца... Залік. Наступны. Чым парадуеце?
*7-мы студэнт:* — Я?..
*Прафесар:* — Вы.
*7-мы студэнт:* — Люблю прадмет...
*Прафесар:* — Які?
*7-мы студэнт:* — Ну, які мы здаём!
*Прафесар:* — А які здаяце?
*7-мы студэнт:* — Які вы прымаеце!
*Прафесар:* — Нават не намякнеце?
*7-мы студэнт:* — А вы што, не ў курсе?
*Прафесар:* — Незалік. Наступны.
*Студэнтка:* — Я прыйшла, каб прызнацца.
*Прафесар:* — Што не ведаеце?
*Студэнтка:* — Не, што ведаю і кахаю.
*Прафесар:* — Удакладніце, каго.
*Студэнтка:* — Вас.
*Прафесар:* Залік! І... пачакайце мяне ў калідоры. Я хуценька закругляюся. Ёсць яшчэ хто?
*Група студэнтаў:* — Паважаны прафесар, віншуем Вас з паспяховым прыёмам залікаў і з нашай паспяховай яго здачай! Вось!
*Прафесар:* — Што — вось?
*Група студэнтаў:* — Нашы заліковыя кніжкі і запрашэнне.
*Прафесар:* — Запрашэнне куды?




*Група студэнтаў:* — У калідор. Там муж студэнткі, якой вы прызначылі спатканне пасля заліку. Ён ужо размінаецца...
*Прафесар:* — Та-ак, хлопцы, стаўлю вам залік і... вельмі спяшаюся!..
Група студэнтаў: — Прафесар, вы куды? Там жа акно!
*Прафесар:* — Нічога — першы паверх. Залікі скончаны!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - рэктарат БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

*Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.*

*Газета падпісана ў друк у 12.00.*

*5 СНЕЖНЯ Зак. 2015. Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.*

В.а. рэдактара Т.М. КАЗАК